# АБ ВЫНІКАХ ПЕРШАГА ТУРА ПАЎТОРНЫХ ВЫБАРАЎ ДЭПУТАТАЎ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ТРЫНАЦЦАТАГА СКЛІКАННЯ, ЯКІ АДБЫЎСЯ 29 ЛІСТАПАДА 1995 ГОДА

Паведамленне Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў

Разгледзеўшы пратаколы акруговых выбарчых камісій, Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў паведамляе:

Першы тур паўторных выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання праводзіўся па сто сорак адной выбарчай акрузе. Агульная колькасць выбаршчыкаў па выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у першым туры паўторных выбараў склала 4154589. Атрымалі выбарчыя бюлетэні 2553688 выбаршчыкаў. У галасаванні прынялі ўдзел 2550608 выбаршчыкаў, або 61,4 працэнта ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

У Брэсцкай вобласці прынялі ўдзел у галасаванні 64,2 працэнта, у Віцебскай – 61,2, у Гомельскай – 63,3, у Гродзенскай – 61,0, у Магілёўскай – 64,2, у Мінскай – 66,1, у горадзе Мінску – 56,6 працэнта выбаршчыкаў.

У першым туры паўторных выбараў выбары абдыліся ва ўсіх (141) выбарчых акругах. Цэнтральная камісія зарэгістравала 18 дэпутатаў. Пытанне аб рэгістрацыі двух дэпутатаў будзе разгледжана на бліжэйшым пасяджэнні.

Па 119 выбарчых акругах, у якіх балаціраваліся больш чым па два кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, але ні адзін кандыдатаў не быў выбраны, 10 снежня 1995 года будзе праведзены другі тур галасавання па двух кандыдатурах, якія атрымалі ў першым туры паўторных выбараў найбольшую колькасць галасоў выбаршчыкаў.

У двух выбарчых акругах (Брэсцкай-Заводскай № 4 і Смаргонскай гарадской № 142) выбары адбыліся, але ў іх дэпутаты не выбраны, таму што ні адзін з кандыдатаў не набраў неабходнай колькасці галасоў. У гэтых выбарчых акругах, у адпаведнасці з артыкулам 57 Закона Рэспублікі Беларусь “Аб выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь”, будуць праведзены паўторныя выбары.

Паведамленні аб выніках выбараў па кожнай выбарчай акрузе апублікаваны акруговымі выбарчымі камісіямі ў мясцовым друку.

Спіс зарэгістраваных дэпутатаў публікуецца.

Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь
па выбарах і правядзенню
рэспубліканскіх рэферэндумаў

5 снежня1995 года